2. The 4 stages of Culture Shock – Swedish for Professionals [Electronic resource]. – 2019. – http://swedishforprofessionals.com/4-stages-of-culture-shock. – Date of access: 21.10.2019.

3. Why culture shock is good for you [Electronic resource]. – 2019. – Access mode: https://www.worktheworld.com/blog/why-culture-shock-is-good-for-you. – Date of access: 21.10. 2019.

# Гнастыцызм і серыя камп’ютарных гульняў The Elder Scroll’s

*Ражкоў А. А., студ. III к. БДУ,*
*навук. кір. Кодзенеў М. А., ст. выкл.*

The Elder Scroll’s – серыя камп’ютарных гульняў у жанры Action RPG, якая бярэ свой пачатак з 1994 г., як прадукт масавай культуры можа распаўсюджаваць ідэі, якія ўклалі ў яе сцэнарысты. Адзін са сцэнарыстаў гульняў Майкл Кіркбрайдт з’яўляецца, як ён сам казаў у адным са сваіх інтэрв’ю, «практыкуючым гностыкам» [1]. І адгалоссе гнастыцызму магчыма знайсці ў метафізічнай сістэме (якую стварыў менавіта Кіркбрайдт), якую прапаноўвае гэтая серыя гульняў. Дадзены артыкул праілюструе чаргу паралеляў паміж вучэннем гностыкаў і тым метафізічным навучаннем, якое прапаноўваецца ў серыі гульняў.

«Манаміф» – міф аб стварэнні сусвету, які прапаноўвае ўнутрыгульнявая літаратура [2]. Менавіта тут мы можам заўважыць паралелі з гнастыцызмам антычных грэкаў і іх уяўленнямі наконт стварэння сусвету [3].

Гэтак жа, як і ў гнастыцызме, мы маем першапачатак (першаматэрыю), што была, магчыма, створана звонку, якая ажыццяўляе працэс эманацыі спачатку да першай пары эонаў (Ану і Падамай), а тыя, «праліўшы сваю кроў» падчас касмалагічнай тэамахіі (пад чым хутчэй за ўсё маюцца на ўвазе далейшыя эманацыі, аб чым гаварылася вышэй), нараджаюць астатнія групы эонаў (Магнэ-Гэ і Даэдра) і архонтаў (Аэдра), фарміруючы тым самым Этэрыўсс і Аблівіён (Плярома).

Эон Сафіі таксама прысутнічае ў дадзенай сістэме пад імем «Нір» (Жаночы пачатак / Космас). Нір жа, як мы ведаем, нарадзіўшы ад Ану «Стварэнне», была забітая Падамаем, а з рэшткаў Нір і «Стварэння» быў створаны Мундус (бясформенная матэрыя). Падчас трактоўкі дадзенага эпізоду варта адзначыць той факт, што ў некаторых крыніцах Ану можа трактавацца як той самы невядомы Бог-Творца (а Падамай, адпаведна, яго альтэр-эга. Гэтым, дарэчы, і тлумачыцца пасаж у «Дзіцячым Ануадзе» [4], які абвяшчае тое, што менавіта Ану і Падамай стварылі Аўрбіс). Такім чынам, можна сцвярджаць пра тое, што Нір была здзейснена спроба Іерагаміі з вышэйшым

пачаткам сусвету, аднак, за што Сафія была забітая (выкінутая з Пляромы), тым самым утварыўшы Мундус (бясформенную матэрыю – Ахамот).

І далей варта звярнуць увагу на Лорхана – Дэміўрга свету «Старажытных Скруткаў». Менавіта яму загадваецца крадзеж неўміручасці (пнеўмы) для стварэння Нірна (Света матэрыяльнага). Аэдра ж сталі архонтамі Нірна (а некаторыя і зусім перасталі быць Багамі-Эонамі, утварыўшы з сабе першых смяротных). Варта, праўда, адзначыць, што ў гнастычным міфе, у адрозненні ад Манаміфу, менавіта Сафія ўкараніла пнеўму ў матэрыю, у той час як тут гэта прэрагатыва Лорхана. Але нягледзячы на гэта, дадзенае гнастычнае прачытанне Манаміфа адпавядае метафізічнай карціне эльфаў у свеце «Старажытных Скруткаў». Аднак Манаміф мае паралелі і з іншымі філасофскімі плынямі (а менавіта з неаплатанізмам), на аснове якіх і грунтуецца светапогляд чалавечых рас свету «Старажытных Скруткаў», але ў канстэксце тэмы дадзенага артыкула ўзгадвацца яны тут не будуць.

**Літаратура**

1. Answered Questions concerhihg Michael Kirkbride // Reddit [Электронный ресурс]. – 2014. – Режим доступа: https://www.reddit.com/r/teslore/comments/1pv78e/ask_michael_kirkbride_anything_the_aftermath. – Дата доступа: 05.08.2019.

2. Мономиф // The Elder Scrolls Wiki [Электронный ресурс]. – 2013. – Режим доступа: https://elderscrolls.fandom.com/ru/wiki/%D0%9C%D0%BE%D0%BD%D0%BE%D0%BC%D0%B8%D1%84. – Дата доступа: 05.08.2019.

3. Гностический миф // Новосибирский государственный университет [Электронный ресурс]. – 2005. – Режим доступа: https://nsu.ru/classics/gnosis/myth_valent.htm. – Дата доступа: 10.09.2019.

4. Детский Ануад // The Elder Scrolls Wiki [Электронный ресурс]. – 2013. – Режим доступа: https://elderscrolls.fandom.com/ru/wiki/%D0%94%D0%B5%D1%82%D1%81%D0%BA%D0%B8%D0%B9_%D0%90%D0%BD%D1%83%D0%B0%D0%B4. – Дата доступа: 05.08.2019.

# Трансфармацыя літаратурна-крытычных жанраў у медыяпрасторы

*Рудачэнка Я. А., студ. III к. БДУ,*
*навук. кір. Часнок І. Ч., канд. філал. навук, дац.*

Змяняецца час, а разам з ім пэўныя змены адбываюцца і з літаратурна-крытычнымі жанрамі. Паводле даследчыка А. Мальчэўскай, сучасная інфармацыйная прастора прадугледжвае пісаць пра мастацтва не ў аналітычным жанры, а ў інфармацыйным (хоць у цяперашнім мастацтве не стала менш наватарскіх падыходаў і эксперыментаў, якія былі ў пачатку мінулага